Пад кіраўніцтвам партыі—на штурм трэцяга і рашаючага, уперад, чырвонаштандартны ленінскі комсамол!

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 1 (1270) | ЧАЦЬВЕР, 1-га студзеня 1931 г.

„Асноўная ўстаноўка партыі ў даны момант заключаецца ў пераходзе ад наступленьня соцыялізму на паасобных вучастках гаспадарчага фронту да наступленьня па ўсяму фронту і ў галіне прамысловасьці і ў галіне сельскай гаспадаркі".

СТАЛІН.

Пяцігодку ў чатыры гады—выканаем

Заціснутыя ў абдымках экономічнага крызісу і апешчаныя перад новым шквалам рэволюцыйнага руху, сусьветныя капіталістычныя драпежнікі шукаюць выхаду ў вайне і ў першую чаргу—інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Працэс „Прампартыі", контррэволюцыйнае дзеяньне арыштаванай у Беларусі групы нац-дэмаў усёй паўнатой выкрылі ўсе махінацыі інтэрвэнцкіх плянаў, накіраваных супроць СССР.

З вялікімі посьпехамі скончыўшы выкананьне плянаў першых двух год пяцігодкі працоўныя Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам пролетарыяту і яго авангарду—комуністычнай партыі ў трэцім рашаючым годзе павінны яшчэ больш узмацніць абароназдольнасьць краіны.

Важнейшы сэнс дасягнутых посьпехаў заключаецца ў тым, што соцыялістычны сэктар заняў пануючае месца па ўсіх важнейшых вучастках нашага будаўніцтва. У выніку гэтага ў прамысловасьці лёзунг „Хто каго" ужо вырашан у карысьць соцыялізму.

Соцыялістычны сэктар у сельскай гаспадарцы па БССР дасягае 20 проц. зямельнай плошчы, а па асноўных збожжавых раёнах 50 проц.

Гэтыя посьпехі здабыты дзякуючы непахіснаму ажыцьцяўленьню ленінскай лініі, жорсткай барацьбе супроць капіталістычных элемэнтаў і іх агентаў у партыі і комсамоле—правых опортуністых і прав—„левацкі" двурушнікаў і прымірэнцтва да іх.

Трэці год гіганцкага будаўніцтва павінен завяршыць пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Гэтая ўстаноўка зьяўляецца адпраўным пунктам размаху будаўніцтва і вызначае тэмпы нашай работы.

Менавіта з гэтай бальшавіцкай устаноўкі выходзяць тыя задачы, якія стаяць перад верным памоцнікам партыі—Ленінскім комсомолам.

Разгортваючы далейшую работу па ўзмацненьню аспарчай дзейнасьці саюзу на аснове барацьбы за генэральную лінію партыі—ЛКСМБ яшчэ з большай упартасьцю павінен накіраваць сваю дзейнасьць на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны, поўнае выкананьне плянаў, разгортваньне плянаваньня пашырэньне колектывізацыі, ажыцьцяўленьне політыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі. Разгортваючы бязьлітасную барацьбу з усімі опортунізмамі, концэнтруючы галоўны агонь па правым, ЛКСМБ і ў трэцім рашаючым годзе дакажа сваю аддانасьць справе рабочае клясы.

З бальшавіцкай заўзятасьцю, комсамольскай напорнасьцю, пад кіраўніцтвам партыі—пяцігодку ў чатыры гады выканаем.

Перад тварам рашаючага году

(Гутарка з сакратаром ЦК КП(б)Б тав. Геем)

1931 год зьяўляецца трэцім годам пяцігодкі. Па шэрагу асноўных паказчыкаў мы павінны ўжо на працягу гэтага трэцяга году выканаць, а часткова перавыканаць канчатковыя заданьні пяцігадовага пляну. Аб'ём прамысловай продукцыі БССР быў прадугледжан паводле пяцігодкі для апошняга году ў 534 мільёны рублёў. Аднак, прамысловасьць БССР ужо ў трэцім годзе пяцігодкі перавышае гэта заданьне.

Паводле пяцігадовага пляну вызначалася колектывізаваць да канца пяцігодкі 13 проц. сялянскіх гаспадарак БССР,—гэта заданьне ўжо перавыканана: у новы гаспадарчы год мы ўступаем з колькасьцю колектывізаваных гаспадарак каля 15 проц.

Выкананьне і перавыкананьне пяцігадовага пляну, якое праводзіцца з вялікім посьпехам, ня толькі ня зьніжае напружанасьці тэмпаў і напружанасьці работы ў будучым гаспадарчым годзе, але, наадварот, патрабуе яшчэ большай выразнасьці, адказнасьці ў рабоце, яшчэ большай шпаркасьці тэмпаў выкананьня. Важнейшыя гаспадарчыя заданьні на надыходзячы 1931 год патрабуюць, як і раней, поўнай мобілізацыі сіл партыйнай організацыі. Прамысловасьць БССР у 1931 годзе павінна больш чым падвоіць сваю продукцыю ў параўнаньні з 1929-30 годам. Побач з выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну па ўсіх колькасных паказчыках, парторганізацыі на прадпрыемствах павінны забясьпечыць пералом у справе паляпшаньня якасьці продукцыі.

У галіне сельскай гаспадаркі нам прадстаіць зрабіць рашучыя крокі для вырашэньня жывёлагадоўчай проблемы і проблемы тэхнічных культур.

Узьнікшыя ў мінулым годзе колгасы вытрымалі першы экзамен першага гаспадарчага году. У надыходзячым гаспадарчым годзе да колгасаў будуць прад'яўлены яшчэ больш высокія патрабаваньні. Трэба рашуча пакончыць з рэшткамі ўтрыманскай псыхолёгіі ў колгасах, дабіцца рашучага пералому ў справе правільнай організацыі працы і разгарнуць будаўніцтва колгасаў больш шпаркімі тэмпамі, чым гэта мела месца да апошняга часу. Асноўным мэтодам вырашэньня гэтае задачы ў колгасах зьяўляецца паслядоўнае правядзеньне прынцыпаў працоўнага дня.

Ні адно з заданьняў, якія стаяць перад партыяй ня можа і ня будзе выконвацца ў парадку самацёку. Толькі опортуністыя могуць уяўляць сабе справу такім чынам, што будаўніцтва соцыялізму праходзіць гладка. Шалёнае супраціўленьне кулацтва і рэштак іншых экс.пёататарскіх клясаў праяўляецца; шкодніцтва, якое выкрыта на цэлым шэрагу вучасткаў, яшчэ ня выкарчавана да канца. Усё гэта патрабуе ад партыйнай організацыі клясавай пільнасьці і рашучага адпору ўсім варожым кулацкім капіталістычным элемэнтам і іх агентуры ў шэрагах партыі—правым і „левым" опортуністым.

Посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва, з якімі партыя ўваходзіць у трэці год пяцігодкі, абумоўлены паслядоўным ажыцьцяўленьнем генэральнае лініі партыі. Партыя адстаяла гэту лінію ў барацьбе супроць правых опортуністых, супроць „левых" заскокаў, супроць бяспрынцыпнага права-„лявацкага" блёку. У выніку—нябывалае яшчэ да гэтага часу згуртаваньне партыйных шэрагаў вакол ленінскага ЦК УсеКП(б), кіруючага справай будаўніцтва соцыялізму. Але перажыткі опортуністычных хістаньняў і ўхілаў усё яшчэ маюць месца ў організацыі. Правядзеньне раду адказнейшых гаспадарчых кампаній, у асаблівасьці кампаніі па мобілізацыі грашовых сродкаў і па загатоўках хлеба, мяса, ільну і іншых продуктаў сельскай гаспадаркі, выкрывае далёка не адзінкавыя выпадкі правага опортунізму на практыцы.

Рашучая бязьлітасная барацьба супроць усіх опортуністычных вылазак, супроць усіх скажэньняў генэральнае лініі партыі, у асаблівасьці, барацьба супроць пасыўнасьці, опортуністычнай стаўкі на самацёк, бюрократызму, чыноўніцтва і формальна-абыякавых адносін да справы—зьяўляецца неабходнай прадпасылкай для таго, каб шырока разгарнуць колгаснае будаўніцтва, узмацніць ролю саветаў у справе ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і з посьпехам выканаць заданьні трэцяга году пяцігодкі.

Праверка выкананьня ўсіх дырэктыў і пастаноў партыі—вось на што трэба націснуць у надыходзячым годзе і, карыстаючыся гэтай зброяй, выявіць і вылавіць усіх шкоднікаў і опортуністых, якія імкнуцца перашкодзіць соцыялістычнаму будаўніцтву.

Наперад імчыцца цягнік

Трэцяму году пяцігодкі

Дарога наперад цярністая,
Насустрач—
агні і
агні.
Упартай рукой машыністы
Кіруе ў далеч цягнік.

Трывожна грукочуць
Чыгунныя колы,
Прыдушана рэй і гудуць...
Сканалі пад коламі
Скруха і голад,
Што краю сулілі жуду.

Загоены раны
На мускульным целе.
Адужаны зграі ваўкоў...
І змоўклі крывавыя
Пес ні мяцеліц,
Што хуталі
Край навакол.

Наш вораг і зараз
Крывавую зброю
Нэрвова узнімае ўгару...
Адказ бальшавіцкі:
Руйнуючым боем
Зламіць, ды імчацца угрунь.

Цягнік разьвівае
Імклівую скорасьць.
На ім машыністы—
Напружаны сталь.
Мігаюць лагчыны,
Высокія горы
Ляцяць у беспрадонную даль.


Вышэй узнімаецца
Дзён урачыстасьць,
Бліжэй падплываюць агні.
Упартай рукой машыністы
Кіруе у далеч цягнік.

Сяргей Ракіта

План 3-га году пяцігодкі выканаем

ЗАВЯРШЫМ ПАБУДОВУ ФУНДАМАНТУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ

УПЕРАД, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!



ЗА: соцыялістычную сельскую гаспадарку, ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльн. колектывізацыі жывёлагадоўлю, сьвінаводзтва і тэхнічныя культуры.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) вызначыў праграму разгортваньня соцыялістычнага будаўніцтва на 3-ці рашаючы год пяцігодкі. Гэтая праграма, зьяўляецца праграмай далейшага разгортваньня соцыялізму па ўсім фронце—праграма паскораньня тэмпаў росту соцыялістычнай індустрыі будаўніцтва савгасаў і колгасаў.

Перад трэцім годам пяцігодкі ў галіне соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, яе колектывізацыі, стаяць вялікія задачы. На базе разгортваньня будаўніцтва савгасаў і колгасаў, сельская гаспадарка павінна забясьпечыць сельска-гаспадарчай сыравінай прамысловасьць, мясам і гароднінай рабочага спажыўца:

БССР, якая ў сыстэме Савецкага Саюзу зьяўляецца асноўным раёнам жывёлагадоўлі (у прыватнасьці сьвінагадоўлі) і тэхнічных культур: лён, канапля і інш., прызвана адыграць вялікую ролю ў выкананьні агульнага пляну 3-га году пяцігодкі.

Адсюль перад комсамолам, як памочнікам партыі, стаяць задачы: Па-першае, і самае галоўнае далей разгортваць колектывізацыю і ў адпаведнасьці з гэтым весьці рашучую барацьбу за спэцыялізацыю сельскай гаспадаркі БССР, змагацца з разьвіцьцём вядучых галін сельскай гаспадаркі, якімі ва ўмовах БССР у асноўным зьяўляюцца жывёлагадоўля і разьвіцьцё тэхнічных культур: лён, каноплі; змагаючыся за ажыцьцяўленьне лічбы—35-45 проц. упарта ажыцьцяўляць палітыку ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, па-другое забясьпечыць свой актыўны ўдзел у рацыянальным выкарыстаньні тых вялікіх сум, якія будуць закладзены ў сельскую гаспадарку.

Задачы і работа перад комсамолам стаіць вялікая. Комсамол з скі зможа выканаць пасьпяхова гэтыя задачы толькі пры ўмове, калі ўзьніме тэмпы сваёй работы на ўзровень агульных тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва, калі кожная комсамольская ячэйка, выходзячы з агульных задач раёну, колгасу, намеціць плян сваёй конкрэтнай дзейнасьці. Калі мэтод соц. спаборніцтва, і ўдарніцтва зьявіцца асноўным мэтодам работы ў штодзённай дзейнасьці комсамольскай ячэйкі.

Разьбіваючы ўшчэнт права-опортуністычнае прароцтва, аб непасільнасьці ўзятых тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва, ЛКСМБ разам з усёй рабочай клясай павінен сваёй адданай і ўпартай барацьбой за генэральную лінію партыі забясьпечыць пасьпяховае і поўнае выкананьне кантрольных лічбаў 3-га году пяцігодкі.

Пад сьцягам соцыялістычнай рэконструкцыі

Аб'яднаныя ў колгасы дзесяткі тысяч бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б у 1930 г. паказалі сапраўдныя бальшавіцкія ўзоры працы ў правядзеньні дзьвюх пасеўных кампаній (вясеньняй і асеньняй) і ўборачнай. Расла плошча соцыялістычнага сэктару. Спачатку вясны гэтага году ўдзельная вага пасеўнай плошчы соцыялістычнага сэктару (савгасаў і колгасаў) раўнялася толькі 5 з паловай процантам, а к канцу 1930 г. ужо маем 18 проц.

13,2 проц. колгасных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР, сумесна з савгасамі, далі ў 1929-30 годзе валавой продукцыі ўвогуле на 19,7 проц. і таварнай продукцыі—46,3 проц.

Ураджайнасьць савгасаў і колгасаў БССР перавышае ураджайнасьць індывідуальнага сэктару на 22,1 проц.

З сёньняшняга дня мы ўступаем у трэці, рашаючы год пяцігодкі, гэты год будзе вырашаць генэральны лёзунг нашай партыі: пяцігодка ў чатыры гады.

Перагорнем лісты пляну 3 году пяцігодкі, глянем на карту БССР

Згодна пастановы ўраду БССР, агульную пасеўную плошчу ў 1931 годзе намячаецца павялічыць на 12,4 проц., што давядзе памеры гэтай плошчы да 4083000 га. Павялічаньне ўраджаю мяркуецца ў наступных лічбах. Па збожжавых культурах у савгасах—на 11 проц., у колгасах—на 10 проц., індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках—на 8 проц. Па ільну—на 15 проц. і па бульбе—на 10 проц.

Пашырэньне пасеўнай плошчы вядучых культур па рэспубліцы намечана на 17,4 проц. з тым, каб адносная вага пасеўных плошчаў соцыялістычнага сэктару была даведзена да 37 проц., у параўнаньні 18 проц. мінулага году.

Найбольш важнай, рашаючай работай зьяўляецца задача далейшай колектывізацыі БССР.

Выходзячы з агульнай устаноўкі—колектывізаваць у асноўным да канца пяцігодкі бядняцка-серадняцкія гаспадаркі СССР—па БССР на ўвесь 1931 г., гэта значыць да студзеня 1932 г., намечана ахапіць колектывізацыяй 45 проц., бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Далейшая колектывізацыя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР патрабуе ад усёй рабочай клясы, савецкага актыву і ўсіх партыйных і комсамольскіх ячэек стаць на чале ўздыму новага колгаснага руху, разгортваньня работы па вярбоўцы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у старыя колгасы і організацыі новых, упартае ажыцьцяўленьне політыкі ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, барацьба з кулацкай агентураю, правымі і левымі опортуністамі.

Для забясьпечаньня сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасьці, у веснавую сельска-гаспадарчую кампанію 1931 г. будзе завезена трактароў, магутнасьцю да 20000 сіл, сельска гаспадарчых машын і прылад на суму 7530000 руб. і 95000 тон мінэральных угнаеньняў.

К вясьне 1931 г. у БССР організуецца 20 машына-трактарных станцый, якія павінны будуць узараць 230000 га і засеяць 80000 га ў колгасах і вытворчых таварыствах. Трактарны парк за ўвесь 1931 год павінен узрасьці з 750 да 2500 штук.

Саюз павінен даць лепшых комсамольцаў на працу ў машына-трактарныя станцы.

БССР пертварыцца з краіны спажывецкай у вытворчую

Вялікае месца ў 1931 годзе адводзіцца разьвіцьцю тэхнічных культур: ільну, канапель і бульбы.

Пасеўная плошча пад ільном, у параўнаньні з мінулым годам, павінна быць сёлета павялічана на 53 проц. і пад канапляй на 85 пр

Плошча пад ільном у асноўных ільнаводных раёнах павінна складаць ад 15 да 30 проц. агульнай пасеўнай плошчы гэтых раёнаў.

Плошча пад бульбай у колгасах павінна будзе заняць 217000 га.

Колектыўныя гаспадаркі ільнаводных раёнаў будуць забясьпечаны ў першую чаргу мінэральнымі ўгнаеньнямі. Будуць прыняты захады да мэханізацыі процэсаў уборкі, абмалоту і першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель.

Проблема жывёлагадоўлі—на парадку дня

Асноўнымі вагарамі ў вырашэньні гэтае проблемы, як і проблемы хлеба, зьяўляюцца буйныя савгасы і колгасы. Разьвіцьцё жывелагадоўлі будзе вырашана праз разьвіцьцё спэцыялізаваных савгасаў і колгасаў.

У колгасах і савгасах БССР ужо сёньня налічваецца 50000 штук малочнай жывёлы, а ўсяго ў соцыялістычным сэктары больш 200000 штук рагатай жывёлы і 130-140 тысяч сьвіней.

На будучы год мяркуецца паставіць у спэцыялізаваных гаспадарках соцыялістычнага сэктару 140 тысяч штук малочнай жывёлы і 232600 штук сьвіней. Вырашэньне проблемы жывёлагадоўлі патрабуе адначасова і вырашэньня кармовай проблемы. Комсамольскія ячэйкі павінны прыняць рашучыя захады для дапамогі партыі і рабочай клясе ў вырашэньні гэтай важнейшай з важнейшых проблем.

Пералічаныя вышэй, далёка няпоўныя, паказчыкі ў галіне соцыялістычнай рэконструкцыі і індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, у сувязі з пераўтварэньнем Беларусі з рэспублікі спажывецкай у рэспубліку таварную (разьвіцьцё жывёлагадоўлі і тэхнічных культур), патрабуюць наўдзесяц роцых тэмпаў, напружаньня ўсіх сіл.

Гэтыя задачы ня змогуць быць вырашаны без рашучай барацьбы з кулаком і яго агентурай—опортуністымі, таму непрымірымая барацьба на 2 фронты зьяўляецца асноўнай умовай пасьпяховага выкананьня гэтых задач.

Х. Б.

ОРГАНІЗАТАРЫ УДАРНАЙ РАБОТЫ

Да зьезду ідзем з перамогамі

Наша ячэйка складалася з 17 чалавек.

Асеньня-пасеўная кампанія была для нас вялікім політычным экзаменам, мы яго трымалі на ўсіх франтох гаспадарчага будаўніцтва. Шырока-выкарыстоўваючы ў сваёй рабоце мэтод ударніцтва, соцыялістычнага спаборніцтва, ячэйка ў час асеньняй пасеўнай кампаніі актыўна змагалася за выкананьне пляну асеньняй сяўбы. Ячэйкай былі організаваны 6 брыгад па уборцы ўраджаю. Брыгады складаліся з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Каб пасьпяхова скончыць абмалот ураджаю, ячэйка паладзіла суботнікі і організавала работу ў начныя зьмены. Комсамольцы і моладзь за начныя зьмены абмалацілі 2 тоны жыта.

Уборка бульбы ў першы час пра одзіла слаба. Ячэйка напрудзіла ўсе сілы, мобілізавала піонэратрад і вучняў ШКМ, склала брыгаду ў сярэднім з 300 чалавек і за 5 дзён выкапалі 15 гектараў бульбы.

Ячэйка ў раёне сваёй дзейнасьці засіласавала 4 ямы, што дало 37 тон сілоснай масы.

Для выкананьня пляну зяблевай узоркі ячэйка організавала 3 брыгады. У брыгады былі ўцягнуты комсамольцы, дарослыя колгаснікі і беспартыйная моладзь. Аднак, плян зяблевай узоркі мы ня выкапалі поўнасьцю.

Організавалі 15 чырвоных абозаў

У пачатку хлебазагатоўчай кампаніі ячэйка організавала 8 чырвоных абозаў, якімі з ана 10 тон збожжа і 11 тон бульбы. Да 13-ай гадавіны кастрычнікавай рэволюцыі ячэйка організавала яшчэ 7 чырвоных абозаў. Гэтыя абозы здалі на 711 пудоў збожжа.

Пры напружанай і ўпартай рабоце комсамольскай ячэйкі і ўсёй грамадзкасьці сельсавету, агульны плян хлебазагатовак па сельсавеце выканан на 99,5 проц.

Ячэйка распаўсюдзіла сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады" на 175 рублёў, комсамольцы і іх гаспадаркі падпісаліся на 625 рублёў.

Распаўсюджана акцый трактарацэнтру сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на 50 рублёў. Значную работу прарабіла ячэйка і па збору агульных плацяжоў і паёў. Ячэйка склала шэраг брыгад, якія сыстэматычна праводзяць работу па вёсках і разам з сябрамі сельсавету зьбіраюць плацяжы і паі.

За 2 месяцы вырасьлі на 19 чалавек

На першае кастрычніка 1930 г. у ячэйцы было 17 чал. 31 кастрычніка на сёньня ячэйка вырасла на 19 чал., з іх колгасьнікаў-батракоў—5, беднякоў—7, рабочых — 1, батракоў неколгасьнікаў—5, саматужнікаў—1

Адначасова ячэйка мяркуе організаваць цэхавыя ячэйкі пры колгасе „Полымя" з 9 чалавек і „Батрак"—з 8 чалавек. У партыю перадалі 4 чалавек з іх 2 батракі.

2 калгасы і 3 аддзяленьні—наш падарунак комсамольскім зьездам

Комсамольцы правялі шэсьць справаздачных сходаў па разьмеркаваньню ўраджаю, акрамя гэтага праводзіліся сходы па колектывізацыі, выходзячы з пастановы 16 партзьезду.

Складзена 6 ініцыятыўных груп па ўцягненьню ў колгасы, куды ўваходзяць 15 комсамольцаў і 10 чалавек беспартыйнай моладзі. 3 комсамольцы зьяўляюцца кіраўнікамі ініцыятыўных груп.

Паміж групамі колгасаў паладжана соцспаборніцтва. Ініцыятыўнымі групамі колгасу „Полымя" і комсамольцамі в Каменева організавана аддзяленьне колгасу з 9 гаспадарак у вёсцы Войстрыня Нясенскага сельсавету.

Пасьля райконфэрэнцыі КСМ ячэйка абвясьціла сябе мобілізаванай па разгортваньню работы па організацыі колгасаў у падарунак Х-му зьезду ЛКСМБ, і ІХ УсеЛКСМ дзеля чаго склала 3 брыгады. Вынікі працы наступныя:

Організаваны ў вёсках Ладасна і Аленчыкі колгас імя Х-годзьдзя БССР з 20 гаспадарак.

У вёсках Задоры, Рамаўцы і Ліпіншчына організаваны колгас імя „Колгасная Праўда" з 18 гаспадарак. Організаваны 2 аддзяленьні колгасу „Згода" у вёсках Уладзімерава з 6 гаспадарак і ў вёсках Сьнежня і Торганшчына таксама з 6 гаспадарак. Усяго за час падрыхтоўчай работы да зьезду організаваны 2 колгасы і 3 аддзяленьні з 59 гаспадарак. На 1 сьнежня сельсавет колектывізаваны на 60 проц.

Запэўніваем зьезды

Чарговыя задачы комсамольскай ячэйкі: весьці яшчэ больш упартае змаганьне за разгортваньне колгаснага руху і ажыцьцяўляць політыку ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, умацоўваць новаорганізаваныя і старыя колгасы, уцягваць у колгасы батрацка-бядняцкую моладзь і ўзмацніць працу па выкананьню лёзунгу—100 проц. уцягненьня рабочых і батракоў у комсамол.

Каменская ячэйка запэўнівае Х зьезд ЛКСМБ і ІХ зьезд УсеЛКСМ, што яна і ў далейшым будзе праводзіць сваю работу пад кутом погляду бязьлітаснай барацьбы з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, „левымі" загібамі і прымірэнцтвам да іх, пад кутом погляду выкананьня чарговых гаспадарча-політычных дырэктыў партыі.

Насуперак гора-пракорам Целешавым, якія енчылі аб безактыўнасьці комсамолу і крызісе актыву, мы яшчэ з большай энэргіяй і энтузіязмам будзем змагацца за пашырэньне соцыялістычнага будаўніцтва на вёсцы, ударна падрыхтуемся да правядзеньня другой бальшавіцкай вясны, яшчэ больш пашырым тэмпы колектывізацыі на аснове яе, ажыцьцяўляць політыку ліквідацыі кулацтва, як клясы.

По даручэньню сходу—
Кацнэльсон

МОВАЮ ЛІЧБ ГАВОРЫЦЬ КЛЯСА

Перамагаючы цяжкасьці соцыялістычнага будаўніцтва, пролетарыят пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі пасьпяхова выканаў пляны мінулых год і ўдарнага кварталу, згуртаваўшы свае шэрагі для яшчэ большага штурму на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, барацьбы за выкананьне плянаў 3 году пяцігодкі

Лепшым колектывам комсамолу—сапраўдным барацьбітам за пяцігодку ў чатыры гады,—сьцяг імя ЦК ЛКСМБ

Трэцяму году пяцігодкі рапартуем:

* * *

— Менскі завод „Комунар", 29-га сьнежня а 4 гадз. дня, выканаў плян ударнага кварталу. Завод прыступіў да выкананьня плянаў 3 году.

* * *

— Ліцейны цэх Гомельскага заводу імя Ланцуцкага, у адзнаку ад астатніх цэхаў, перавыканаў плян ударнага кварталу і прыступіў да 3 году.

* * *

— Гута імя Домбаля, ня гледзячы на мінулыя прастоі і прарывы, 27-га сьнежня выканала плян ударнага кварталу. Гута прыступіла да ліквідацыі мінулых прарываў

* * *

— Гомельскі завод „Пролетары", дзякуючы ўпартай працы рабочага колектыву, 25 сьнежня скончыў праграму ўдарнага асобнага кварталу.

* * *

— Чырвонаштандартны завод „Бальшавік" скончыў праграму ўдарнага кварталу 23-га сьнежня, у разьмеры 100,92 проц.

* * *

— Гомельская шчацінная фабрыка і гарбарня „Пролетарскі шлях" датэрмінова скончылі праграму асобнага кварталу.

М. Галадзед

Трэці і рашаючы

31 год вырашае выкананьне пяцігодкі за 4 гады*)

Мы ўваходзім у 1931 г.—3-ці і рашаючы год пяцігодкі—з вялізарнымі перамогамі на фронце разгорнутага соцыялістычнага наступленьня. Пасьпяховае выкананьне першых 2-х гадоў пяцігодкі, са значным перавыкананьнем проэктаваньняў пяцігодкі па важнейшых і рашаючых галінах народнай гаспадаркі абумовіла поўную магчымасьць запроэктаваць народна-гаспадарчы плян на 1931 г. у значна павышаных разьмерах.

Прыняты аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры Савецкага Саюзу на 1931 год з'яўляецца гіганцкай праграмай бальшавіцкіх работ па завяршэньню пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Характэрнай рысай пляну 1931 г. зьяўляецца і тое, што асноўная маса капітальных укладаньняў накіроўваецца на галоўнейшыя індустрыяльныя об'екты з устаноўкай на скарачэньне тэрмінаў будаўніцтва і з мэтай хутчэйшага пуску ў дзейнасьць новых індустрыяльных гігантаў.

Ажыцьцяўленьне народна-гаспадарчага пляну 1931 г. ёсьць новы, нячуваны ў гісторыі чалавецтва, разьбег па будаўніцтву соцыялізму. Гэты плян і яго ажыцьцяўленьне ёсьць новы гіганцкі скачок у соцыялістычнае гаспадарства.

Разам з узмацненьнем сродкаў і ўвагі ў бок забясьпячэньня шпаркага росту важнейшых галін індустрыі плянам вызначаюцца вялікія задачы па соцыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. Устаноўка на завяршэньне ў асноўным колектывізацыі па галоўных збожжавых раёнах Савецкага Саюзу і на завяршэньне ў гэтых раёнах ліквідацыі кулацтва, а таксама давядзеньне колектывізацыі ва ўсім Савецкім Саюзе да 50 проц. усіх сялянскіх гаспадарак—ёсьць фактар вялікага гістарычнага значэньня.

Пры ажыцьцяўленьні гэтай задачы наш Савецкі Саюз зьявіцца зусім непераможнай дзяржавай, у якой ня толькі будзе закончана пабудова фундаманту соцыялістычнай экономікі, але будзе зроблены новы гіганцкі крок па організацыі соцыялістычнага грамадзтва.

Народна-гаспадарчы плян БССР, прыняты СНК і ўхвалены сэсіяй ЦВК БССР, зьяўляючыся часткай агульнага Саюзнага пляну, таксама вызначае павышаныя тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР, якія далёка перавышаюць проэктаваньні пяцігодкі.

Асноўную ўвагу ва ўмовах БССР мы павінны концэнтраваць на далейшым узмацненьні вядучай ролі прамысловасьці ў разьвіцьці народнай гаспадаркі БССР і паставіць у цэнтры ўвагі ўсіх савецкіх, партыйных, профсаюзных і грамадзкіх організацый задачу ажыцьцяўленьня суцэльнай колектывізацыі сельскай гаспадаркі і на гэтай падставе няўхільна праводзіць ліквідацыю кулацтва, як клясы. У галіне прамысловасьці мы павінны сконцэнтроўваць увагу на выкананьні прамфінпляну 1931 году, асабліва на яго якасных паказчыках, павялічэньне продукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту прамродукцыі, абавязковае палепшаньне якасьці і інш.—гэтыя задачы павінны быць выкананы.

Зусім зразумела, што дадатныя вынікі выкананьня першых двух год пяцігодкі і павышаныя проэктаваньні на 1931 г. зьявіліся вынікам цьвёрдага праведзеньня генэральнай лініі партыі, рашучага перамаганьня супраціўленьня клясавага ворага; кулака, нэпмана, шкодніка і націонал-дэмократа і ў поўным банкруцтве і разгрому правых опортуністых і ўсякіх права-„левацкіх" беспрынцыпных блёкаў.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне народна-гаспадарчага пляну 1931 году патрабуе ад усіх рабочых, колгасьнікаў і ад усіх партыйных і савецкіх організацый далейшага няўхільнага праведзеньня ленінскай палітыкі нашай партыі і сыстэматычнай барацьбы з усімі опортуністычнымі праяўленьнямі з боку нястойкіх, хісткіх элемэнтаў. Трэба і надалей змагацца у бок нявызначанай опортуністы, нам і правапортуністычнае рызыкай з соцыялістычнай дарогі.

На шляху выкананьня пляну соцыялістычнага будаўніцтва мы будзем сустракаць цяжкасьці і надалей з вялікімі труднасьцямі, на перамаганьне якіх мы павінны мобілізаваць максымальную ўвагу ўсёй пролетарскай, партыйнай і савецкай грамадзкасьці.

Вопыт мінулых гадоў паказаў, што рабочая кляса і наша пролетарская дзяржава маюць незьмерна вялікія крыніцы энэргіі, мобілізаваўшы якія мы можам рухаць соцыялістычнае будаўніцтва нячуванымі вялікімі тэмпамі. Таму нашай задачай зьяўляецца мобілізаваць усе гэтыя скрытыя энэргіі і матэр'яльныя рэсурсы на пасьпяховае выкананьне народна-гаспадарчага пляну 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Дык—за новых перамог, з новымі сіламі—у бой за соцыялізм, разгорнутымі пролетарскімі шэрагамі па шляху, які нам паказвае ленінскі ЦК УсеКП(б) і яго правадыр—тав. Сталін. Пашырым і ўзмоцнім фронт соцыялістычнага наступленьня і у горадзе і ў вёсцы. Ліквідуем кулацтва як клясу на базе суцэльнай колектывізацыі.

*) Артыкул друкуецца ў скарочаным выглядзе.

Не на словах, а на справе

Комсамольцы „Камунара" паказалі сілу бальшавіцкага штурму

Завод „Комунар" заснаваўся з 3-х, саматужнага тыпу, заводаў: „Усход", „Мэталь" і сельска-гаспадарчыя майстэрні.

Ад гэтых заводаў ён атрымаў старое абсталяваньне. Аднак, умовы працы не адпавядаюць тым тэмпам, якія ўзяў на сябе завод. Дзякуючы правільнаму партыйнаму кіраўніцтву і энтузіязму рабочых мы дасягнулі вялікіх осьпехаў, аб якіх сьведчыць зьмешчаны ніжэй матар'ял.

Па выкананьню прамфінпляну першых двух гад ў пяцігодкі завод „Комунар" ішоў у першых шэрагах. Ён перавыканаў свае прамфінпляны, як у колькасных, так і ў якасных паказчыках.

Прамфінплян ударнага кварталу паказаў сапраўдныя, бальшавіцкія тэмпы па выпуску продукцыі. У параўнаньні з 4-м кварталам 1929-30 году выпуск продукцыі павялічыўся на 43,7 проц. Бальшавіцкія тэмпы працы паставілі перад комсамольскім колектывам пытаньне аб рашучым павароце ўсёй працы колектыву тварам да вытворчасьці, прычым усе зьвесткі сьведчаць аб тым, што колектыў заводу здолеў зрабіць гэты паварот.

Першым ініцыятарамі соцспаборніцтва—аднэй з комуністычных форм працы—былі комсамольцы. На сёньнешні дзень соцспаборніцтвам ахоплены ўсе комсамольцы і рабочая моладзь заводу. Далейшым разьвіцьцём спаборніцтва была організацыя ўдарных брыгад, вытворчых комун, скразных брыгад і г. д. Комсамольцы паказалі прыклад, як павінны працаваць сапраўдныя ўдарнікі і комунары. Аб гэтым сьведчаць факты.

Першая комуна ліцейнага цэху організавана комсамольцамі, якія далі 12 проц. павышэньня продукцыі насустрач кантрольным лічбам. Калі здарыўся прарыў па ліцьцю, яны абвясьцілі сябе мобілізаванымі, адмовіліся ад выхадных дзён пакуль ня будзе ліквідаваны прарыў.

Калі ня вышлі закідчыкі для заправкі вагранкі, што пагражала зрывам адліўкі, комсамольцы, пасьля 7 гадзіннай працы, першыя мобілізаваліся на закідку, заявіўшы адміністрацыі, што ня пойдуць дамоў пакуль не ад'едзецца ад'іўка.

Дзякуючы своечасовай мобілізацыі комсамольцаў і энтузіязму усіх рабочых цэху, прарыў па ліцьцю на 29 га сьнежня быў амаль што ліквідаваны.

У цэху створаны 4 вытворчыя комуны, 100 проц. кантрактацыі комсамольцаў да канца пяцігодкі, 100 проц. ахоп ударніцтвам.

У сьлясарна-зборачным цэху працуюць 6 вытворчых комун, 4 ударныя колектывы імя 10-га зьезду ЛКСМБ, 2 ударныя вучнёўскія брыгады. Усе комсамольцы і моладзь законтрактаваны да канца пяцігодкі, ахоплены соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Яны не на словах, а на справе паказалі бальшавіцкія тэмпы выкананьня прамфінпляну ўдарнага кварталу

На 25 проц. перавыканан прамфінплян па комсамольскіх ударных колектывах, што дае звыш пляну 23 камнедрабілкі ў падарунак Х-му зьезду ЛКСМБ.

Брыгада па бэтоні таўвым варштатам скончыла свой прамфінплян на 7 дзён раней тэрміну і дае звыш пляну 44 варштаты. Брыгада па швэйным точкам дае таксама значнае перавышэньне прамфінпляну.

Комсамольцы добраахвотна зьнізілі расцэнку на сваю працу да 20 проц.

У такарным цэху, дзякуючы мобілізацыі комсамольцаў, былі ліквідаваны прарывы.

Для ліквідацыі прарываў была організавана штурмавая брыгада імя „Х-га зьезду ЛКСМБ", якая сапраўды паказала сілу бальшавіцкіх штурмаў. Комсамольцы добраахвотна згадзіліся працаваць на паўтары зьмены, каб толькі не стаяў варштат.

У выніку гэтай працы цэх перавыканаў прамфінплян на 10 проц. Тут, як і ў папярэдніх цэхах, комсамольцы на 100 проц. ахоплены ўдарніцтвам і кантрактацыяй. У такарным цэху працуюць 4 вытворчыя комуны і 1 штурмавая брыгада

Комсамольскі колектыў прыняў актыўны ўдзел у вытворчых манэўрах заводу.

Па цэхах расстаўлены пасты „лёгкай кавалерыі". Яны кожны дзень сачаць і вядуць барацьбу з прагуламі, спазьненьнямі і іншымі парушэньнямі працдысцыпліны. Імёны прагульшчыкаў вывешваюцца на чорных дошках заводу. Правяраюцца на даму прычыны нявыхаду на працу. Увесь колектыў быў мобілізаваны. Гэта праца і далейшая нясупынная ўвага да выкананьня прамфінпляну забясьпечыла выкананьне за кастрычнік на 101,3 проц., у лістападзе—100,1 проц і датэрміновае выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу, які скончан 29 сьнежня.

Падрыхтоўка да 3-га, рашаючага году пяцігодкі, таксама выклікала актыўнейшы ўдзел комсамольцаў у прапрацоўцы сустрэчнага прамфінпляну. Комсамольцы такарнага цэху высунулі сустрэчны плян на 23 проц.; ліцейнага цэху—на 12 проц., сьлясарнага цэху—на 43 проц.

Лёзунг—шэфства комсамолу над рабочымі прапановамі—ператварыўся ў жыцьцё. Сабрана 160 рабочых прапаноў, з якіх 6 даюць экономію звыш 115000 рублёў.

Колектыў прыняў актыўны ўдзел у вырашэньні проблемы аб мобілізацыі ўнутраных сродкаў. Былі організаваны суботнікі па збору лому з удзелам 50 чалавек. Кантрольныя лічбы па збору лому мы перавыканалі на 300 проц., бо фактычна сабралі 231 тону лому і стружак, з мет заданьня ў 74 тоны.

На сёньняшні дзень на заводзе налічваецца 7 вытворчых комун, адзін ударны колектыў імя Х-га зьезду ЛКСМБ, 12 ударных колектываў, 6 ударных брыгад, 5 скразных і 1 штурмавая.

Самакантрактацыяй і ўдарніцтвам ахоплены ўсе комсамольцы і большасьць рабочай моладзі.

Усе гэтыя вынікі працы комсамольскага колектыву дасягнуты пад кіраўніцтвам партыйнага колектыву заводу і дзякуючы мобілізацыі ўсіх комсамольцаў і рабочай моладзі на выкананьне і перавыкананьне вытворчых заданьняў нашага заводу.

Акрамя паказаных вышэй форм працы комсамольскі колектыў праводзіў сыстэматычную прапрацоўку гэтых пытаньняў на сходах ячэек, колектыву, мітынгу і агульных заводзкіх конфэрэнцыях рабочай моладзі нашага заводу.

Нашы посьпехі—вынік рашучай барацьбы з правым ухілам і „левымі" загібамі, як у тэорыі, так і ў практыцы.

Своечасовы роспуск бюро дзьвюх ячэек за праваопортуністычную практыку, мобілізацыя рабочай моладзі і рашучы адпор пасобным праявам правых настрояў далі нам магчымасьць атрымаць перамогу ў барацьбе за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Бюро колектыву.

Даём 30 і 10!



Комсамольская брыгада заводу „Полымя Рэволюцыі" ў падарунак 3-му году ўзьняла прадукцыйнасьць працы на 30 проц. і зьнізіла расцэнку на 10 проц.



ЧЫРВОНЫЯ БАЙЦЫ НА ДАЗОРЫ

Пад цьвёрдай надзейнай аховай савецкіх межаў забясьпечым новыя перамогі соцыялізму ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі

Курсанты АБВШ паднясуць комсамольскім зьездам баявы рапарт паказчыкаў росту сваёй баяздольнасьці

Мацаваць баяздольнасьць і на лыжах

Сучасная абстаноўка, а таксама і тактыка складаных будучых форм бою, якія патрабуюць ад кожнага байца Чырвонай арміі дзейнічаць на полі бою ў розных умовах, ставяць перад кожным байцом і камандзірам адказныя задачы ў справе фізычнага разьвіцьця і загартоўкі. Дзеля гэтага на фізычнае разьвіцьцё байца неабходна зьвярнуць вялікую ўвагу. Неабходна навучыць і ўцягнуць яго ў зімовы час карыстацца лыжамі.

Будучая вайна прымусіць нас дзейнічаць і на лыжах. Адсюль абавязак кожнага байца палюбіць лыжы і лыжны спорт, што дасьць яму надзвычайна вялікую карысьць.

Курсанты АБВШ вельмі многа ўвагі ўдзяляюць гэтай справе. Ужо тыдзень таму назад лыжы разьмеркаваны між разьдзеламі школы. Як толькі выпаў першы сьнег, курсанты пачалі актыўна трэніравацца. Летась курсанты таксама мелі вялікую цягу да лыжнай справы таму разьдзел, які ўдзельнічаў у акруговых лыжных спаборніцтвах, заняў 2-е месца сярод вайсковых частак БВА.

Сёлета школа мае на мэце паставіць лыжную падрыхтоўку на вышэйшую ступень. Лёзунг школы—„На першае месца сярод частак БВА і Вузаў РСЧА—будзе выкананы.

Таму сёлета неабходна ўзмацніць трэніроўку. Парыў да лыжнага спорту ў курсантаў вялікі. Неабходна будзе курсантам, зьвярнуць увагу на свайго шэфа—комсамольскія організацыі, уцягнуць іх у гэту справу шляхам паездкі на вёскі, агульных выхадаў на лыжах і тактычных выхадаў разам са школаю, што дасьць і вялікую карысьць у лыжным спорце і адначасова павысіць вайсковую падрыхтоўку нашых комсамольцаў. Ітак наш лёзунг:—„За карысную спортыўную культуру. Байцы Чырвонай арміі, разам з рабочай моладзьдзю,—на лыжы".

Курсанты АБВШ:
Грынь Апанас,
Вайтовіч Якуб,
Ясюзэня Мікола,
Шрубак Алесь.

Прынясем комсамольскаму зьезду рапарт сваіх дасягненьняў

Уся падрыхтоўчая работа да комсамольскіх зьездаў у комсамольскім колектыве АБВШ праходзіць пад лёзунгам яшчэ большага ўзмацненьня барацьбы за генэральную лінію партыі супроць опортунізму, за актыўны ўдзел комсамольскага колектыву па падвяцьцю баявой падрыхтоўкі школы, за 100 проц. ахоп комсамольцаў соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам, за пераход да вышэйшай формы ўдарніцтва, (ударныя брыгады, буксір і г. д).

Комсамольскі колектыў абвяшчае сябе ўдарнікам імя X зьезду ЛКСМБ і IX зьезду ЎсеЛКСМ. Кожная ячэйка павінна разгарнуць яшчэ большую работу па збору прапаноў у галіне палепшаньня баявой падрыхтоўкі.

Уся работа па падрыхтоўцы да зьезду ў колектыве комсамолу і ячэйках АБВШ праходзіць па-ўдарнаму. Да адчыненьня зьезду мы прыйдзем з рапартам аб сваіх дасягненьнях.

Ксочэня, Вайтовіч Якуб,
Шрубак Алесь.

У фонд абароны

* Настаўнікі Дукорскай сямігодкі імя 16 партызан, Сьміла скага раёну, у адказ на падрыхтоўку капіталістычных краін да інтэрвэнцыі супроць СССР, унесьлі 55 руб. на абарону краіны і выклікаюць насьледаваць этаму прыкладу настаўнікаў Чэрвеньскай сямігодкі.

* Комуна „Зьвязда" Астрашыцка-Гарадоцкага раёну, у адказ імпэрыялістым і іх агентам—контр-рэволюцыянэрам Рамзіным і Кº—унесла ў фонд абароны краіны 150 рублёў.

Комунары ўзялі на сябе абавязак завербаваць 20 членаў ТД Авіяхэму і ўзмацніць работу гуртка ваенізацыі.

* У карысьць дырыжаблебудаўніцтва СССР, студэнты Гомельскага агра-пэд'інстытуту, у колькасьці 80 чалавек, адпрацавалі 8 гадзін на выгрузцы бульбы і выклікаюць астатніх пасьледваць іх прыкладу.

* Студэнты Марына-Горскага сельска-гаспадарчага тэхнікуму сабралі 150 рублёў у карысьць абараноздольнасьці краіны.

Пухавіцкім райсаветам таварыства ТД-Авіяхэму сабрана праз суботнік і пастановы п'есы у фонд абароны каля 300 рублёў.

* Комсамольцы савгасу Любань, Пухавіцкага раёну, сабралі ў фонд абароны краіны 15 руб., а таксама ад суботніку 7 рублёў, і здалі на пабудову дырыжабля „Клім Варашылаў". Комсамольцы выклікаюць на соц. спаборніцтва Тураўскую чэйку ЛКСМБ пасьледваць іх прыкладу.

* Ячэйка ТДА у Стара-Сельскай профтэхшколе сабрала ў карысьць савецкага дырыжаблебудаўніцтва на дырыжабль імя „Праўда" 25 рублёў.

Комсамольская ячэйка пры колгасе „Беларусь" Бягомельскага раёну, сабрала у фонд абароны 50 рублёў.

Ячэйкі ТД-Авіяхэму на ывае працівагазаў, выпісвае 15 экзэмпляраў часопісу „Авіяцыя і Хэмія" і 15 экзэмпляраў газэты „Красная Звезда".

„Бой" у полі

Сцямнела. Дзьме рэзкі вецер. Заўтра, 14-12—30 г., адбудзецца выхад у поле студэнтаў Мэдшколы, каб набыць першапачатковыя веды ў тактычна-стралковай падрыхтоўцы.

Бадзёры настрой.

Гучны рогат разносіцца па пакоях студэнтаў.

Зараз зьявіліся лістоўкі з пастаўленымі на заўтра задачамі:

Ах отна прачыталі. абмеркавалі.

Раніца ўстрывожыла салодкі сон.

Сёньня выхад у поле. Хутка накінулі вопратку. На двары зноў вецер. Невялікі мароз шчыпле за твар.

Але нічога. Настроі ёсь.

Тлумачыцца баявая задача

— Усё зразумела?—Шагам марш!

З-заду на калёсах тарахціць „Максімка".

Дасягнулі выходнага пункту.

Зьвесткі аб „праціўніку". Расставілі кулямёты ў права і ўлева на ўзгорку, каб забясьпечыць наступленьне.

Затарахцеў „Максімка", выбіваючы чачотку—тра-та-та-та.

Зашчоўкалі са стрэльбаў.

То там, то тут перабягаюць студэнты.

Наблюжаюцца да сініх.

Ідзе назапашаньне сіл для апошняй сутычкі. Каманда:

— Уперад!—Ура!.. Ура!..

Праціўнік зьбіт. Кароткі разбор.

На першы раз заняткі прызналі здавальняючымі.

Аднак, выяўлена і абгаворана шмат недахопаў.

Патрэбна каб у далейшым гэтыя недахопы былі ўлічаны, як вурокі для такіх заняткаў.

Астапенка А ВШ.

З глыбокім крызісам капіталістычны сьвет уваходзіць у 1931 год

Контрабандысты ОЗОЛС—натхніцель антысавецкай кампаніі

РЫГА. „Пэдэя Брыды", указвае, што нядаўна ў офіцыёзе Савецкай Расіі—газэце „Известия" апублікаваны выкрыцьці, якія датычаць дзейнасьці мінулага латвійскага пасьланіка ў Маскве К. Озолса. У сувязі з гэтым газэта піша: „У апошні час у газэце „Рўнакас Зінэс" зьяўляюцца артыкулы, якія ня добра расцэньваюць выкананьне латвійска-савецкага гандлёвага дагавору. Гэтыя артыкулы ідуць ў разрэз з былой пазыцыяй указанай газэты".

Гандаль калёніямі

ВАРШАВА, 29. Кракаўскі „Кур'ер Ілюстрованы" паведамляе, што, па маючымся веткам, Пілсудзкі скончыў перагаворы з Португаліяй аб продажы Польшчы Португальскай калёніі ў Афрыцы—Ангола. Весткі гэтыя гучаць у дастатковай ступені фантастычна, хаця-б таму, што фінансавае становішча Польшы зусім выключае падобнага роду кантракты.

Польскі вучоны аб пяцігодцы

ВАРШАВА, 29. Вядомы ваенны польскі географ і аўтар лепшага з выдадзеных у Польшчы падручнікаў экономічнай географіі—Цэзак, прачытаў у Лодзі для абранай аўдыторыі даклад аб экономіцы СССР.

Цэзак прымушан констатаваць што „за ўсходняй мяжой Польшчы зьяўляюцца парасткі новага жыцьця". „Пяцігадовы плян, які шмат хто называе д'ябальскім, зьяўляецца на самай справе матэматычна дакладным гаспадарчым плянам. Цяпер у СССР адбываецца грандыёзная работа ва ўсіх галінах жыцьця для рэалізацыі гэтага вялікага пляну Увесь СССР у даны момант уяўляе сабою навуковую лябораторыю, работы якое зусім ашаламляючы", „Неабходна прызнаць,—дабаўляе Цэзак,—што СССР мае вялікі плян работ, якому няма падобнага нідзе ва ўсім сьвеце, нават Амэрыцы, якая дасягнула вяршыні цывілізацыі".

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—
РЭДКОЛЕГІ

Сёньня а 7 гадзіне ўвечары памяшканьні газэты „Беларуская Вёска" адбудзецца агульны адчыны сход колектыву ЛКСМБ рэдакцыі газэт.

На абвестцы дню пытаньні: Прапрацоўка тэзісаў т. Салтана „колгаснае будаўніцтва і задачы комсамолу на вёсцы". 2. Паведамленьне аб рашэньнях бюро колектыву і інш.

Яўка комсамольцаў з прычыны надзвычайнай важнасьці пытаньня абавязкова і без спазьненьня.

Бюро к-ву.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599